**4. ГУ́ТАРКА**, мастацка-публіцыстычны, найчасцей ананімны твор, у якім ставяцца актуальныя пытанні нар. жыцця ці грамадскай маралі; жанр бел. літаратуры 19 ст. Г. найб. пашырыліся ва ўмовах актывізацыі вызв. барацьбы народа, асабліва напярэдадні сял. рэформы 1861 г. і паўстання 1863–64 («*Гутарка Данілы са Сцяпанам*», «*Вось цяпер які люд стаў*», «*Гутарка двух суседаў*» і інш.). Пазней Г. выкарыстоўвалі рэв. народнікі для прапаганды сваіх ідэй. Напісаныя ў белетрызаванай форме або ў форме размовы 2 ці больш асоб, Г. тлумачылі простаму народу праблемы грамадскага жыцця, вострай крытыкай існуючага ладу ўздзейнічалі на грамадскую свядомасць. Папулярнасць і сац. дзейнасць жанру Г. выкарыстоўвалі і рэакц. аўтары для прапаганды афіц. ідэалогіі і палітыкі самаўладдзя («*Прамова Старавойта да сялян аб свабодзе*» Ф. Блоса, «*Бяседа старога вольніка з новымі пра іхняе дзела*» А. Кісяля). У канцы 19 ст. Г. страціла сваю грамадскую пафаснасць і набыла дыдактычны характар, сац. праблематыка саступіла месца маральным павучанням. У пач. 20 ст. як жанр паступова знікла.

**4. Тып слоўніка —** __________________________________________.

**5. Гу́тарка**. “Беседа, болтовня”, гуто́рить, гута́рить, гуто́ра, укр. гу́тір “разговор, беседа”, гуто́рити “болтать”. Стар. складанне з *gu- (ср. го́вор) і да тарато́рить, торото́рить, лит. tar̃ti, tariù “гаварыць, вымаўляць”; гл. Фрэнкель, "Glotta" 4, 33; аналагічна Бернекер (1, 364), але ён мяркуе вытворнае на -t- ад да го́вор, параўн. ірл. guth “голас”, тады як Прэабр. (1, 172) прымае кантамінацыю *гаварыць* і *тарато́рыць*.

**5. Тып слоўніка —** ____________________________________________.

**6.** гу́тар-к-а — *суф., ад* гутар/ы/-(ць)

**6. Тып слоўніка —** ____________________________________________.

**Заданне 8.** Запішыце адказы на пастаўленыя пытанні.

*Максімальны бал — 6.*

1. *Лабазнік* — гэта ўстарэлае слова, якім называлі ўладальніка лабаза або прадаўца тавару ў лабазе. Што ж прадаваў гэты чалавек? __________________

______________________________________________________________________

2. *Вірутнік* — слова размоўнае і лаянкавае. Якога чалавека так называлі? Запішыце два сінанімічныя прыметнікі ў пачатковай форме: ______________ __________________________________________________________ .

3. *Брэцёр* — састарэлае слова, якое мае сінонімы ў сучаснай мове. Запішыце два з іх: _____________________________________________________

4. *Інсургент*. Гэтае састарэлае слова часта ўжываў У. Караткевіч. Якім сінанімічным словам яно можа быць патлумачана? Запішыце: ____________________

5. Дойлід — гэта спецыяліст у галіне дойлідства. Запішыце сінонімы да слоў *дойлід* і *дойлідства*: _____________________________________________

6. Алесь Якімовіч прыгадваў: «Стары Чапскі, а потым і яго сыны не хацелі аддаць луг сялу, падкупілі *каморнікаў*, і тыя перапраўлілі планы». Каго ж падкупілі Чапскія? — __________________________________________________

**Заданне 9.** Прачытайце радкі з верша і адкажыце пісьмова на пытанні.

*Максімальны бал — 6.*

Калі у крыўдзе мне сябры
Грaзіліся бацькамі,
Тады хацелася наўзрыд
Заплакаць шчырымі слязамі.

Не плакаў я – усім на злосць.
Бо ў хаце быў адзін — мужчына.
Не йшоў ты...
Маці маладосць
Глыбей заворвалі маршчыны.

1. Аўтар і назва верша: _________________________________________
2. Якія гукі дазваляюць паэтам павялічваць і памяншаць колькасць націскных і ненаціскных складоў? Запішыце гэтыя гукі ў квадратных дужках: ___________________________________________________
3. Выпішыце радкі, дзе гэтыя гукі выконваюць адзначаныя функцыі, і падкрэсліце літары, што абазначаюць іх:

____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

**Заданне 10.** Запоўніце прапушчаныя месцы.

*Максімальны бал — 6.*

1. Літаратура XI–XII стст. паводле паходжання была *перакладная* і *арыгінальная*, а паводле зместу __________________________________________ (0,5 бала) і __________________________________________ (0,5 бала).

2. Пры вывучэнні старажытных помнікаў пісьменства важна ведаць, што твор, напісаны аўтарам, называўся — ___________________________________

(0,5 бала), а перапісаны ў майстэрні пазней — ___________________________
(0,5 бала).

3. Пісьменнікі-юбіляры 2022 г. Запішыце іх імёны і прозвішчы (4 балы):

| № | Перыфраза | Імя і прозвішча (псеўданім) | Гады |
|---|---|---|---|
| 1. | Пасляваеннае жыццё было цяжкім не толькі для людзей, але і для жывёл, што і адлюстраваў пісьменнік у апавяданні “Алені”. | | 90 |
| 2. | На лірычныя вершы паэта кампазітары часта ствараюць песні, шырока вядомымі сталі: “Явар і каліна” (музыка Ю. Семянякі), “Малітва” (музыка А. Молчана), “Жняя” (музыка А. Багатырова) і інш. | | 140 |
| 3. | Аўтар ліра-эпічнай паэмы, за якой замацавалася назва “энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства канца XIX – пачатку XX стагоддзяў”. | | 140 |
| 4. | Нарач, Нарачаншчына – гэта “родны кут”, малая радзіма паэта. Але ў яго творчасці яны сімвалізуюць і ўвесь родны край, усю Беларусь. | | 110 |

II ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

IX клас

19 лістапада 2022*

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусляравым наспе жвіровым
Палыны узышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.

Лет за сотню звёў час, ці і болей мо лет,
Зацвілі пераказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед
З кургана, як снег, белы выходзе.

Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць,
Жменяй водзіць па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.

Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веры даць, толькі слухаць душой...
Курганы шмат чаго нам гавораць.

*Янка Купала, 1910 г.*
*урывак з паэмы “Курган”*

ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

XI клас

*19 лістапада 2022 г.*

## У ВЕРАСНЁЎСКІ ВЕЧАР

Лагодны вечар, ціхі, вераснёвы.
Кучомкі хвой замлелі ў цішыні,
І мой дубок не зрушыцца ні-ні,
І я маўчу, ніжу на слова словы.

Адзін я тут, а горад, смуглы, ніцы,
У цемрадзі схаваў журбу руін,
І толькі выплыве на міг адзін –
Не дом – шкілет пры ўзлёце бліскавіцы.

Далёка дзесь на цёмным небасхіле
Паблісквbooць маланкі раз-параз,
Нібы не верасень, а жнівеньскі той час,
Калі цяплынь у поўнай яшчэ сіле.

Хоць можа верасень аплаціць золкасць лета
І дні яго, што мыліся ў дажджы.
І раптам – журавы! Крычаць: “Дабра не жджы!
Не час цяплу, і песня яго спета”.

І чую ў крыку тым я праўду і дакоры,
Што год прайшоў і блізка час зімы,
А працы шмат... Ці шмат жа ўспелі мы,
Каб раны залячыць і сцішыць наша гора?

Турботных рук патрэбна многа ўсюды,
Каб зняць праклятае кляймо вайны.
Вышэй узлёт раскутых сіл буйны!
Народ-герой! Тварыць ты можаш цуды...

Праз цёплы мрок у вечар вераснёвы,
Дзе свецяцца прыветныя агні,
Паказваюць свой твар мне заўтрашнія дні
І родны край, збудованы нанова.

*Якуб Колас,1945 г.*

X клас

*19 лістапада 2022 г.*

## Я НЕ ГАНЮ ЗЕМЛІ ЧУЖЫЯ…

Я не ганю землі чужыя, –
Хай іх сонца не абміне.
Толькі дзе б за морам ні жыў я,
Беларусь мая снілася мне.

Так карцела – сляза закіпала, –
Каб да сэрца хаця б здалёк
Прыплывалі жалейка Купалы,
Багдановічаў васілёк...

Гэта ўсё, безумоўна, не нова.
А ці трэба, каб новым было
Поле бацькава, матчына мова
І над хатай буслова жытло?

Хіба душы свае не лечым
Ад бяздомных бядот і згрызот
Самым простым і самым вечным,
Што пранёс праз вякі народ?

І якія б шляхі ні схадзіў я,
Кліча полацкая сенажаць...
А калі не спяваць аб Радзіме,
Дык навошта наогул спяваць?

*Генадзь Бураўкін, 1979 г.*

II ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

**IX клас**

*20 лістапада 2022, Гродна*

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | **60** |

**Заданне 1.** Сярод слоў, пададзеных у дужках, устанавіце тыя, што адпавядаюць акцэнталагічным і арфаграфічным нормам сучаснай беларускай мовы. Падкрэсліце іх.

*Максімальны бал – 6 (0,5 бала за кожнае правільнае слова).*

1. У лесе снег бялеў і хрупаў пад нагамі, разганяючы страхі (ці́шы, цішы́) і (поцемкаў, пацёмкаў). 2. Птушка спявала (ці́хенька, ціхе́нька). 3. Вокны (на́глуха, наглу́ха) завешаны чорнай паперай. 4. Лабановіч сеў за стол, каб зрабіць (на́кід, накі́д) плана прамовы. 5. З гэтымі словамі ён пакорліва прысеў (на ку́кішкі, кукі́шкі). 6. У адну любую раніцу ў Такароўшчыне пачынаўся такі шум, такі (га́рмідар гармі́дар, гармідá́р) ажно з ваколічных блізкіх вёсак прыбягалі сюды, як на пажар. 7. Алена Аляксандраўна, нягледзячы на (за́нятасць, заня́тасць), старалася хадзіць дамоў са школы пешшу. 8. Стаю я гэта, бачу: ідуць тры панічы як панічы, а насустрэчу ім якась пані маладая, ніштавата сабою, у (капялю́шы, капелюшы́) з (рашато́, рэшато́, рэ́шата). 9. Дзесьці за (Ко́пылем, Капы́лем, Капылё́м) аўтобус спыніўся і дзеці дружна высыпалі з яго. 10. Анупрэй пачаў ужо добра ўваходзіць у ролю расказчыка, як раптам асеннюю цішыню пад (па́хмурным, пахму́рным) небам агаласіў крык на вуліцы.

**Заданне 2.** Запоўніце табліцу.

*Максімальны бал — 6 (1 бал за кожную правільна запоўненую клетку)*

| Рускі фразеалагізм | Беларускі фразеалагізм-адпаведнік | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|---|
| глотать слюни | глытацьсліну | з зайздрасцю, з прагнасцюглядзець на што-небудзьсмачнае, прывабнае, але недаступнае; |
| глотать слова | глытаць словы | гаварыцьнеразборліва, невыразна; недагаворвацьслоў; |
| глотать слёзы | глытаць слёзы | стараццастрымаць слёзы; не плакаць. |

**Заданне 3.** Запішыце формы множналікавых назоўнікаў і значэнне, якое набываюць гэтыя назоўнікі, калі яны ў выніку семантычнага пераасэнсавання пераходзяць у разрад множналікавых. *Максімальны бал – 6 (0,5 бала за кожную пазіцыю)*

| Адзін. назоўнік | Значэнне | Множналікавы назоўнік | Значэнне |
|---|---|---|---|
| будзень | ‘несвяточны дзень’ | будні | ‘штодзённае жыццё’ |
| нота | ‘графічны знак для запісу гукаў музыкі’ | ноты | ‘тэкст музычнага твора ў нотным запісе’ |
| слова | ‘моўная адзінка, якая выражае паняцце’ | словы | ‘літаратурны тэкст вакальнага твора’ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ролік | ‘невялікае металічнае кольца на ножках мэблі’ | ролікі | ‘канькі на калёсках’ |
| драбінка | ‘дробная часцінка чаго-небудзь’ | драбінкі | ‘у калясцы – бакавая абрашотка’ |
| сардзіна | ‘прамысловая рыба’ | сардзіны | ‘кансервы з гэтай рыбы’ |

**Заданне 4.** Прапанаваныя наступныя словы: *артыстызм, бандытызм, будызм, бытавізм, візантызм, капіталізм, ленінізм, наплявізм, пазітывізм, сімвалізм, скандынавізм, ухілізм*. З улікам словаўтваральных адметнасцей размяркуйце іх па шасці групах (колькасць слоў у кожнай групе аднолькавая). Назавіце гэтыя групы.

*Максімальны бал — 6 (0,6 бала – назва групы,*
*0,4 бала – за правільна ўказаныя словы ў групе)*

1) утвораны ад уласных неадушаўлёных назоўнікаў: *візантызм ← Візантыя, скандынавізм ← Скандынавія*;
2) утвораны ад уласных адушаўлёных назоўнікаў: *ленінізм ← Ленін, будызм ← Буда*;
3) утвораны ад агульных неадушаўлёных назоўнікаў: *капіталізм ← капітал*; *сімвалізм ← сімвал*;
4) утвораны ад агульных адушаўлёных назоўнікаў: *артыстызм ← артыст*; *бандытызм ← бандыт*;
5) утвораны ад дзеясловаў: *наплявізм ← напляваць*; *ухілізм ← ухіляцца*;
6) утвораны ад прыметнікаў: *бытавізм ← бытавы*; *пазітывізм ← пазітыўны.*

**Заданне 5**. Вядомы беларускі паэт Алесь Бадак у зборніку “Развітанне з вечнасцю: Кніга лірыкі з каментарыямі” (с. 221–222) прызнаваўся, што рэдактар палічыў некаторыя радкі з яго верша “Трава” алагічнымі і выправіў іх.

*Максімальны бал — 6.*

1. Рэдактар выправіў *два радкі* (1 бал).
2. Тлумачэнне (3 балы). Рэдактар здзейсніў такую праўку, кіруючыся логікай (1 бал), змяя не можа крычаць, яна *шыпіць* (1 бал), сава не можа шыпець, яна *крычыць* або *кугіча* (1 бал).
3. Запісаныя выпраўленыя радкі (1 радок = 1 бал) = 2 балы

| | |
|---|---|
| Закрычыць змяя,<br>зашыпіць сава —<br>У лясной глушы<br>зацвіце трава.<br>…Зацвіла трава<br>незлічоная,<br>Кветка белая,<br>кветка чорная. | *Зашыпіць змяя,*<br>*закрычыць сава —* |

**Заданне 6.** Словазлучэнні рускай мовы са словам “подвергать” перакладаюцца на беларускую мову, як правіла, адным дзеясловам. Запішыце гэтыя дзеясловы.

*Максімальны бал — 6.*

1) Бамбардзіраваць; 2) абмяркоўваць; 3) аглядаць; 4) рызыкаваць; 5) катаваць; 6) дапытваць; 7) знявольваць; 8) абшукваць; 9) караць; 10) выпрабоўваць; 11) сумнявацца; 12) насміхацца (смяяцца, кпіць).

**Заданне 7.** Пасля кожнага слоўнікавага артыкула запішыце тып слоўніка.

*Максімальны бал — 6.*

1. Тып слоўніка — *тлумачальны*.2. Тып слоўніка — *паэтычны*.3. Тып слоўніка — *граматычны*.4. Тып слоўніка — *энцыклапедычны*.5. Тып слоўніка — *этымалагічны*.6. Тып слоўніка — *словаўтваральны*.

**Заданне 8.** Запішыце адказы на пастаўленыя пытанні.

*Максімальны бал — 6.*

1. Зерне, муку.2. Дрэнны, нікчэмны. 3. Дуэлянт, забіяка (чалавек, які шукае нагоды, каб змагацца на дуэлі).4. Паўстанец.5. Архітэктар і архітэктура. 6. Спецыялістаў па межаванню (абмеру) і землеўпарадкаванню зямельных надзелаў.

**Заданне 9.** Прачытайце радкі з верша і адкажыце пісьмова на пытанні.

*Максімальны бал — 6.*

1. Аўтар і назва верша (2 балы): *Рыгор Барадулін "Бацьку".*

2. Якія гукі дазваляюць паэтам павялічваць і памяншаць колькасць націскных і ненаціскных складоў? Запішыце гэтыя гукі ў квадратных дужках (2 балы): *[ў] – [у], [і] – [й].*

3. Выпішыце радкі, дзе гэтыя гукі выконваюць адзначаныя функцыі, і падкрэсліце літары, што абазначаюць іх (2 балы):

Калі **<u>у</u>** крыўдзе мне сябры…
Не **<u>й</u>**шоў ты...

**Заданне 10.** Запоўніце прапушчаныя месцы.

*Максімальны бал — 6.*

1. Літаратура XI–XII стст. паводле паходжання была *перакладная* і *арыгінальная*, а паводле зместу *царкоўна-рэлігійная* (0,5 бала) і *свецкая* (0,5 бала).

2. Пры вывучэнні старажытных помнікаў пісьменства важна ведаць, што твор, напісаны аўтарам, называўся — *арыгіналам* (0,5 бала), а перапісаны ў майстэрні пазней — *спісам* (0,5 бала).

3. У 2022 г. пісьменнікі-юбіляры. Запішыце іх імёны і прозвішчы:

| № | Перыфраза | Імя і прозвішча (псеўданім) | Гады |
|---|---|---|---|
| 1. | Пасляваеннае жыццё было цяжкім не толькі для людзей, але і для жывёл, што і адлюстраваў пісьменнік у апавяданні "Алені". | *Іван Пташнікаў* | 90 |
| 2. | На лірычныя вершы паэта кампазітары часта ствараюць песні, шырока вядомымі сталі: "Явар і каліна" (музыка Ю. Семянякі), "Малітва" (музыка А. Молчана), "Жняя" (музыка А. Багатырова) і інш. | *Янка Купала* | 140 |
| 3. | Аўтар ліра-эпічнай паэмы, за якой замацавалася назва "энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства канца XIX – пачатку XX стагоддзяў". | *Якуб Колас* | 140 |
| 4. | Нарач, Нарачаншчына – гэта "родны кут", малая радзіма паэта. Але ў яго творчасці яны сімвалізуюць і ўвесь родны край, усю Беларусь. | *Максім Танк* | 110 |

Заўвага: у рабоце за грубыя памылкі (арфаграфічныя, пунктуацыйныя, граматычныя) здымаецца 0,2 балы.

## ДАВЕДКІ
## XIклас

*20 лістапада 2022, Гродна*

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | **60** |

**Заданне 1.***Максімальны бал – 6 балаў*

1) Кемлівасць, кемнасць, знаходка, парада, рэцэпт.

2) Можна ўстанавіць нават пяць характэрных прыкмет:

1. Арыгінальны, нестандартны погляд на праблему.
2. Эканомія рэсурсаў (часу, грошаў, сілы і інш.).
3. Спрашчэнне розных сфер дзейнасці (здароўе, адукацыя, самаўдасканаленне, адносіны і г. д.).
4. Лёгкасць прымянення.
5. Карыснасць для вялікай колькасці людзей.

**Заданне 2.***Максімальны бал – 6*

1. Сяджу я аднойчы ў салдацкай чайной. Бачу – заходзяць чацвёра салдат. Падстрыжаныя, на выгляд – маладыя. Заказалі па пачку (пачаку) пячэння і па шклянцы чаю.

2. Што маці адчула ў тыя хвіліны, / Як вусны пякельна ад смагі гарэлі, – / Без слоў зразумеюць у нашай краіне, / Не толькі хто быў у салдацкім шынялí (шынелі).

3. У Маладзечне калямагазіна «АММІ» прапаў сабака пароды чыхуахуа чорнай афарбоўкі. Просьба вярнуцьзя ўзнагароду.

*Каментар.* Назоўнік ***акраса*** мае ў беларускай мове два значэнні і шэраг сінонімаў. Яго не варта блытаць з рускімі, блізкімі па гучанні словамі «окрас», «окраска», што па сэнсе адпавядаюць аддзеяслоўным беларускім назоўнікам *афарбоўка, афарбоўванне, фарбаванне, маляванне.* Напрыклад, у аб’яве – *Прапаў сабака пароды чыхуахуа чорнага акраса. Просьба вярнуць за ўзнагароду* – замест словазлучэння “чорнага акраса” трэба пісаць “чорнай афарбоўкі”.

**Заданне 3.** Запішыце формы множналікавых назоўнікаў і значэнне, якое набываюць гэтыя назоўнікі, калі яны ў выніку семантычнага пераасэнсавання пераходзяць у разрад множналікавых.

**Узор**: *ласіна* ‘шкура ляся’ → *ласіны* ‘штаны з гэтай шкуры’ (з далейшай семантызацыяй ‘вузкія штаны’).

*Максімальны бал – 6.*

| Адзін. назоўнік | Значэнне | Множналікавы наз. | Значэнне |
|---|---|---|---|
| певень | ‘свойская птушка’ | пеўні | ‘крык пеўняў як прыкмета пары сутак’ |
| галушка | ‘круглы шарык’ | галушкі | ‘страва ў выглядзе дробных клёцак, прыгатаваных на булёне ці малаку’ |
| брус | ‘апілаванае або абчасанае бервяно’ | брусы | ‘гімнастычная прылада з дзвюх круглых паралельных перакладзін’ |
| куплет | ‘страфа верша ці песні’ | куплеты | ‘сатырычная песенька’ |
| радок | ‘частка тэксту або | радкі | ‘напісаныя, надрукаваныя |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | асобныя словы, літары, напісаныя або надрукаваныя ў адну лінію’ | | словы, фразы’ |
| байка | ‘казка, кароткі аповед’ | байкі | ‘пустыя размовы, выдумкі. |

**Заданне 4.** Рускі дзеяслоў “следовать” у залежнасці ад кантэксту перакладаецца шматлікімі словамі ў беларускай мове. Пацвердзіце тэзіс, пераклаўшы прыведзеныя канструкцыі на беларускую мову.

*Максімальны бал — 6*

*(0,5 бала за кожны нарматыўны беларускі адпаведнік)*

1) следовать правилам— *трымацца (прытрымлівацца) правіл*;

2) следовать долгу— *кіравацццаабавязкам*;

3) следовать моде— *прытрымлівацца моды*;

4) следовать учению Павлова— *наследавацьвучэннюПаўлава*;

5) он во всём следовал своему отцу— *ёнусёрабіў так, як ягобацька (або: ёнваўсімбраўпрыкладсасвайгобацькі)*;

6) следовать внушению сердца — *слухаццаўнушэннясэрца*;

7) вам следует обратиться в справочное бюро — *вам трэба (патрэбна, варта, належыць, неабходна) звярнуцца ў бюро даведак*;

8) мне с них следует сто рублей — *мне з іхналежыць сто рублёў*;

9) сколько с меня следует?— *колькі з мянетрэба?*(або: *колькі я вінават(ы)?)*;

10) одно следует из другого— *адновынікае з другога*;

11) отсюда следует вывод, что…— *адсюльвынікае, што…*;

12) сделать как следует— *зрабіць як мае быць (або: як належыць, як след)*.

**Заданне 5.** Выпішыце ў табліцу са сказаў Янкі Купалы фразеалагізмы. Аб’яднайце іх у 6 груп і запішыце значэнне фразеалагізмаў.

*Максімальны бал — 6*

| Фразеалагізмы | Значэнне |
|---|---|
| Пайсці да Абрагама на піва, знайсці дамавіну | ‘памерці, загінуць’ |
| Каменем кінуць, змяшаць з гразёй | ‘зняславіць, незаслужаназневажаць’ |
| У лапці абуваць, карміць забабонамі | ‘абманваць, хітраваць, ілгаць, хлусіць’ |
| Даць пáранкі, даць розаг | ‘пакараць, пабіць, адлупцаваць’ |
| Засыпаць пяском вочы, засыпаць на векі вечныя | ‘пахаваць’ |
| Без аглядкі, ува ўсе капыты | ‘хутка, у імгненневока’ |

**Заданне 6.**Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальны бал — 6.*

Вядомая даследчыца літаратуры З. Мельнікава з Брэста, аналізуючы раман Кузьмы Чорнага “Бацькаўшчына”, адзначае, што паэтыка і сюжэтныя лініі твора маюць багаты падтэкст, ствараць які ўдаецца толькі таленавітым творцам. Пры асэнсаванні рамана Кузьмы Чорнага вынікова рэалізуецца фразеалагічны план выражэння аўтарскай задумы. Архетыпавыя вобразы і матывы-канцэпты твора маюць глыбокі падтэкст. *Хата, поле, зямля, дзірван, лес, балота* – гэта не толькі прасторавыя абазначэнні, але і ментальна беларускія коды быцця, якія ствараюць быційна-філасофскі падтэкст твора.

*Пры праверцы пераказу кіруемся наступным алгарытмам: у тэксце 68 слоў – гэта 6 балаў, калі ўдзельнік зрабіў 5 памылак, то 63 х 6 : 68 = 5,55.*

*За пунктуацыйную памылку (памылкова аформленую сінтаксічную канструкцыю) здымаем 0,2 балы (напрыклад,* вырашыўнарэшцевыходзіць).

*Улічваем варыятыўнасць перакладу: напрыклад, до бесславной смерти – да ганебнай смерці, да бясслаўнай смерці, але калі дапушчана арфаграфічная памылка бесслаўнай, або некалькі памылак безслаўнай, слова не залічваецца.*

**Заданне 7.** Вызначце, у ролі якой часціны мовы выступае слова «окей». Запішыце.

*Максімальны бал — 6.*

| Сказ | Часціна мовы |
|---|---|
| 1. – Ці згодна ты пайсці з намі? – Окей, чаму не? | Часціца |
| 2. Адась адчуваў сябе окей, ён спакойны, у яго добры апетыт і настрой. | Прыслоўе |
| 3. – Стамілася? – Ёсць крыху… – Я аднясу цябе, окей? | Часціца |
| 4. Ніна наогул была аптымістка: верыла ў сябе, сваю сям'ю, працу, у тое, што ўсё будзе окей… | Прыслоўе |
| 5. Клацаеш мышкай «захаваць», націскаеш кнопку «окей» і атрымліваеш асалоду ад выніку. | Назоўнік |
| 6. Учора мне было кепска, а сёння мне ўжо окей. | Слова катэгорыі стану. |

**Заданне 8.** Вы — даследчык-мовазнавец. 1. Раздзяліце сказы на дзве роўныя групы (А і Б). 2. патлумачце, у чым заключаецца сэнсавая розніца паміж гэтымі групамі. 3. Укажыце, што ў сказах адной з груп дапамагае выканаць гэтае размеркаванне.

*Максімальны бал — 6*

1. *за правільнае размеркаванне сказаў – **1 бал** (пры наяўнасці памылак пры размеркаванні – 0 балаў)*

Група А: 1, 3, 6. Група Б: 2, 4, 5.

2. *за апісанне спецыфікі значэння сказаў тыпу А і тыпу Б – 2 балы за кожны тып **(усяго 4 балы);***

Сказы групы А (1, 3, 6) указваюць на рэальную прычыну, сутнасць якой адлюстравана ў дадзеным сказе.

У сказах групы Б (2, 4, 6) указваецца прычына з пункту погляду моўцы (суразмоўніка). Звычайна, такія сказы адлюстроўваюць не рэальнасць, а думку таго, хто гаворыць, пра рэальнасць.

3. *за ўказанне на пабочныя словы ў сказах групы Б – **1 бал***

На гэта ў сказах групы Б указваюць пабочныя словы ў значэнні верагоднасці: *напэўна, відаць, мусіць*.

.

**Заданне 9**.

*Максімальны бал – 6.*

| Максім Танк "Зарапад" 2б | Троп 2б | Функцыя 2б |
|---|---|---|
| А ноч звініць ад камароў.<br>Ланцуг перагрызла Мядзведзіца<br>І Млечным Шляхам да сяла<br>Праз нашу краіну азёрную,<br>Прытопваючы, пайшла<br>Збіраць медзякі зорныя... | ЗВАРОТНАЯ МЕТАФАРЫЗАЦЫЯ | від тропа, сутнасць якога — у вяртанні словам ці словазлучэнням іх першаснага, вобразнага значэння |

**Заданне 10.** Запішыце імёны і прозвішчы пісьменнікаў-юбіляраў 2022 г.

*Максімальны бал – 6.*

| № | Перыфраза | *Імя і прозвішча (псеўданім)* | Гады |
|---|---|---|---|
| 1. | За ўклад у літаратуру ў 1925 годзе атрымаў званне "Народны паэт БССР" і | *Янка Купала* | 140 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | стаў першым, хто так быў ушанаваны. | | |
| 2. | Яго называюць “бацькам” жанру лірычнай мініяцюры. | *Янка Брыль* | 105 |
| 3. | Аўтар зборніка паэзіі “Іранскі дзённік” | *Пімен Панчанка* | 105 |
| 4. | Яго верш “Завушніцы” ў музычнай апрацоўцы У.Мулявіна стаў папулярнай песняй у выкананні “Песняроў”. | *Максім Танк* | 110 |
| 5. | Увайшоў у літаратуру як майстар урбаністычнай тэматыкі. | *Міхась Стральцоў* | 85 |
| 6. | Пашырыў жанравыя межы філасофскай паэзіі. Яго пяру падуладны пункціры, версэты, вершаказы, зномы. | *Алесь Разанаў* | 75 |

Заўвага: у рабоце за грубую памылку (арфаграфічную, пунктуацыйную, граматычную) здымаецца 0,2 балы, акрамя **задання №6**.

## X клас

*20 лістапада 2022, Гродна*

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | **60** |

**Заданне 1.** *Максімальны бал – 6 (1 слова=0,6 бала)*

1) *матавіла*; 2) *драсён*; 3) *пранік*; 4) *прасніца*; 5) *дыля*; 6) *церніца*; 7)*апалушкі* (адзін. ліку няма); 8) *біла*; 9) *сявенька*; 10) *біла*.

**Заданне 2.**Вельмі пашыранымі ў беларускім пісьмовым маўленні з'яўляюцца хібы, што звязаныя з ужываннем прыназоўнікаў. Запішыце ў адпаведнасці з нормай наступныя словазлучэнні.

*Максімальны бал — 6.*

| Ненарматыўнае словазлучэнне | Трэба |
|---|---|
| 1. Куранятлічаць па восені | Куранятлічацьувосень |
| 2. Суседзімаюць час і магчымасцьдаглядаць за куранятамі | Суседзі маюць час і магчымасць даглядаць куранят |
| 3. А ці варта за прыкладамі ісці далёка? | А ці варта па прыклады ісці далёка? |
| 4. Санаторый знаходзіўся кіламетрах упяці ад Маладзечна | Санаторый знаходзіўся кіламетраўза пяць адМаладзечна |
| 5. Звярнуцца па адрасе прадпрыемства | Звярнуцца на адрас прадпрыемства |
| 6. Згодна Закона абмовах | Згодна з Законам абмовах (паводле Закона аб мовах) |

**Заданне 3.***Максімальны бал – 6.*

| Адзін. назоўнік | Значэнне | Множналікавы наз. | Значэнне |
|---|---|---|---|
| дзень | 'прамежак часу, суткі' | дні | 'пэўны час, перыяд жыцця' |
| раскопка | 'дзеянне паводле значэння дзеяслова раскопваць – раскапаць' | раскопкі | 'работы па выяўленні прадметаў старажытнасці' і 'месца, дзе праводзяцца такія работы' |
| кальцо | 'прадмет, які мае форму абруча, акружнасці' | кольцы | 'гімнастычны снарад з двух падвешаных абручоў' |
| іерогліф | 'фігурны знак у сістэме ідэаграфічнага пісьма' | іерогліфы | 'незразумелае пісьмо, неразборлівы почырк' |
| ком | 'кавалак рэчыва груглай формы' | камы́ | 'бульбяная каша' |
| капейка | 'манета найменшай вартасці' | капейкі | 'невялікая сума грошай' |

**Заданне 4.***Максімальны бал — 6 (0,6 бала за 1 слова)*

1) мядзве́дзіна; 2) цяля́ціна; 3) асятры́на; 4) бабро́віна; 5) дзічы́на; 6) труся́ціна; 7) казі́на; 8) свіні́на; 9) парася́ціна; 10) бара́ніна.

**Заданне 5.** Пры тлумачэнні фразеалагізмаў вучань прапусціў прыслоўі. Узнавіце іх.

*Максімальны бал — 6 (1 слова=0,5 бала)*

1. Браць (блізка) да сэрца — *пакутліва, хваравіта* ўспрымаць што-н.

2. Брацьногі на плечы (урукі) — *хутка, паспешна*ўцякаць.
3. Браць (узяць) у лоб — *груба, прасталінейна*дамагацца (дамагчыся) чаго-н.
4. Браць (узяць) у шоры — *моцна* трымаць у руках, *рашуча* і *жорстка* абмяжоўваць каго-н. ва ўчынках.
5. Чэрпаць (браць) каўшом — *многа, празмерна*браць, атрымліваць што-н.
6. Браць (узяць) на абардаж — атакаваць варожае судна, *шчыльна*наблізіўшыся да яго.

**Увага**. Дапускаецца ўжыванне сінонімаў.

**Заданне 6.***Максімальны бал — 6.*

1) На халяву і гарчыца салодкая — 1 бал. 2) Габрава — 1 бал.3) Сталіца гумару (0,5 бала), горад у Балгарыі (0,5 бала). 4) яго армія хоць меншая колькасна, аднак больш «гарачая» падчас бою (1 бал). 5) Муштáрда (1 бал). 6) Гарчычнік (1 бал)

**Заданне 7.** Перакладзіце на беларускую мову.

*Максімальны бал — 6.*

Праначаваў Тэмуджын трое сутак у тайзе і вырашыў нарэшце выходзіць. Узяў свайго каня за аброць і пайшоў. Раптам – нечаканая затрымка: з каня спаўзло сядло. Пачаў ён разглядваць – і бачыць: сядло спаўзло пры туга падцягнутай папрузе і нагрудніку. Тады стаў ён разважаць: «Папруга яшчэ сяк-так, але як магла спаўзці таксама і падгрудная шлейка? Няйначай, што само неба мяне ўтрымлівае». І ён вярнуўся назад і правёў у лесе яшчэ трое сутак, без усялякай ежы, і думае: «Няўжо давесці сябе да ганебнай смерці? Выйду зараз!»

І пачаў зразаць нажом для завострывання стрэл дрэвы, якія не давалі праходу. Неяк правёў ён свайго каня, які спатыкаўся, і ўжо пачаў быў выходзіць на прагаліну. А Тайчыуты тут як тут, вартуюць. Схапілі яго і павялі з сабой.

*Пры праверцы пераказу кіруемся наступным алгарытмам: у тэксце 120 слоў – гэта 6 балаў, калі ўдзельнік зрабіў 5 памылак, то 115 х 6 : 120 = 5,75.*

*За пунктуацыйную памылку (памылкова афармленую сінтаксічную канструкцыю) здымаем 0,2 балы (напрыклад,* вырашыўнарэшцевыходзіць).

*Улічваем варыятыўнасць перакладу: напрыклад, до бесславной смерти – да ганебнай смерці, да бясслаўнай смерці, але калі дапушчана арфаграфічная памылка бесслаўнай,абонекалькі памылак безслаўнай,слова не залічваецца.*

**Заданне 8.***Максімальны бал — 6.*

1. Фразеалагізм: тут як тут — выказнік.
2. Раптам, адразу, у гэты момант (з’явіўся).

Першы сказ: ***Як****– гэта буйная жвачная рагатая жывёліна, якая водзіцца ў высакагорных раёнах Цэнтральнай Азіі.*

Другі сказ: *А ён **як** ускочыць, **як** пабяжыць — толькі яго і бачылі.*

Трэці сказ: *Цякла **тут** з лесу невялічка / Травой заросшая крынічка. Колас.*

**Заданне 9.***Максімальны бал — 6.*

1. Імя і прозвішча аўтара, твор якога вывучаецца на ўроку (1 бал) — Іван Пташнікаў.
2. Жанр і назва твора (2 балы) — апавяданне «Алені».
3. Тэма твора (1,5 балы) — узаемаадносіны чалавека і прыроды.
4. Ідэя твора (1,5 балы) — беражлівыя адносіны да прыроды.

**Заданне 10.** Запішыце імёны і прозвішчы пісьменнікаў-юбіляраў 2022 г.

*Максімальны бал — 6.*

| № | Перыфраза | Імя і прозвішча (псеўданім) | Гады |
|---|---|---|---|
| 1. | Беларусь-партызанка – цэнтральны | *Максім Танк* | 110 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | вобраз зборнікаў паэзіі “Вастрыце зброю”, “Праз вогненны небасхіл”. “Не шкадуйце, хлопцы, пораху…” – наказваў паэт беларускім партызанам. | | |
| 2. | Як драматург распрацаваў новы для беларускай літаратуры жанр – драматычную паэму. | *Янка Купала* | 140 |
| 3. | “Вышэй за ўсё і перш за ўсё – чалавечнасць”, – жыццёвы і творчы дэвіз пісьменніка. | *Янка Брыль* | 105 |
| 4. | “Без чалавечнасці не будзе і вечнасці”, – гэтых слоў паэт прытрымліваўся ў мастацтве і паўсядзённасці. | *Пімен Панчанка* | 105 |
| 5. | Па матывах яго твора ў 1960-1961 гадах была знята мастацкая кінастужка “Першыя выпрабаванні” (рэжысёр У.Кораш-Саблін, аўтары сцэнарыя: М.Лужанін і А.Куляшоў). | *Якуб Колас* | 140 |
| 6. | Аўтар шматпланаванага зборніка паэзіі “Матчын дар” | *Алесь Гарун* | 135 |

Заўвага: у рабоце за грубую памылку (арфаграфічную, пунктуацыйную, граматычную) здымаецца 0,2 балы, акрамя **задання №7**.